Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 33 (685) ● ПЯТНІЦА, 17 лістапада 1967 г. ● Цана 2 кап. Год выдання XXI

## УЗНАГАРОДЫ РАДЗІМЫ

За актыўны ўдзел у Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, грамадзянскай вайне і барацьбе за ўстанаўленне Савецкай улады ў 1917—1922 гг., у сувязі з 50-годдзем Вялікага Кастрычніка Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР узнагародзіў выкладчыка нашага універсітэта Іосіфа Анісімавіча Кажанкова ордэнам Леніна. Ордэна Чырвонай Зоркі ўдастоен прарэктар універсітэта Герой Савецкага Саюза Аляксандр Васільевіч Кірсанаў. Медалямі «За працоўную доблесць» адзначаны прафесар В. І. Сцяпанаў і дацэнт М. С. Зярніцкі.

Высокая ацэнка подзвігаў старэйшых камуністаў радасна сустрэта ўсім калектывам выкладчыкаў, студэнтамі і супрацоўнікамі. Яны жадаюць актыўным удзельнікам барацьбы за перамогу сацыялізма новых поспехаў у працы на карысць Радзіме.

А. КАЛЯДА.

## РАЗАМ З ПАРТЫЯЙ, НАРОДАМ

Асабліва ўрачыста, па-святочнаму адзначыў калектыў універсітэта 50-годдзе Савецкай улады. Юбілейны год быў для яго выключна знамянальным. За поспехі ў развіцці навукі і падрыхтоўку высокакваліфікаваных кадраў старэйшая навучальная ўстанова рэспублікі атрымала ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга. Гэта ўзнагарода натхніла вучоных, студэнтаў, усіх супрацоўнікаў на новыя здзяйсненні.

Усе факультэты і кафедры выканалі свае высокія юбілейныя абавязацельствы, у якіх асаблівая ўвага была звернута на далейшае развіццё і паглыбленне навуковых даследаванняў, удасканаленне вучэбнага працэсу і павышэнне ўзроўню палітыка-выхаваўчай работы. Напярэдадні свята вучэбныя карпусы і інтэрнаты універсітэта былі ўпрыгожаны чырвонымі сцягамі і лозунгамі. Кожны факультэт шырока адлюстраваў сваю гісторыю і ўклад у развіццё эканомікі і культуры краіны ў фотавыстаўках, насценных газетах, маляўнічых дыяграмах. Пераможныя крокі ўніверсітэта асабліва поўна паказаны на выстаўцы «БДУ да 50-годдзя Вялікага Кастрычніка» і выстаўцы навуковых прац і літаратурна-мастацкіх твораў прафесараў і выкладчыкаў.

Цікавыя гутаркі па юбілейнай тэматыцы, сустрэчы з ветэранамі рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, тэарэтычныя і літаратурныя канферэнцыі і іншыя перадсвяточныя мерапрыемствы, у якіх прынялі ўдзел тысячы чалавек, закончыліся ўрачыстымі вечарамі. На факультэтах з дакладамі выступілі старэйшыя прафесары, выкладчыкі, былі арганізаваны тэматычныя канцэрты-кампазіцыі.

4 лістапада адбыўся агульнауніверсітэцкі ўрачысты вечар. У сваім дакладзе рэктар акадэмік А. Н. Сеўчанка расказаў аб тым велічным шляху, які прайшла краіна Саветаў за 50 год свайго існавання, аб поспехах універсітэта ў развіцці навукі і падрыхтоўцы кадраў. Шмат цёплых слоў было выказана ў адрас ветэранаў, пераможцаў сацыялістычных спаборніцтваў. Дакладчык пажадаў плённай працы калектыву і заклікаў усіх выкладчыкаў, студэнтаў і супрацоўнікаў няспынна памнажаць славу Радзімы. У заключэнне адбыўся вялікі канцэрт.

Як і для ўсёй краіны, для універсітэта кожны перадсвяточны дзень прыносіў новую радасць. Радзіма ўзнагародзіла ардэнамі і медалямі актыўных удзельнікаў рэвалюцыі і сацыялістычнага будаўніцтва, граматамі Вярхоўнага Савета БССР адзначаны поспехі нашых крытыкаў, пісьменнікаў і паэтаў.

Унушальнай была наша калона на святочнай дэманстрацыі працоўных Мінска. Універсітэт рапартаваў Радзіме аб тым, што за гады свайго існавання ён падрыхтаваў звыш 22 тысяч высокакваліфікаваных спецыялістаў, занёс у свой падлік сотні навуковых адкрыццяў, выдаў дзесяткі тысяч каштоўных прац па самых розных галінах народнай гаспадаркі і культуры. Калектыў універсітэта прадэманстраваў сваю адданасць партыі і народу, гатоўнасць выканаць любыя заданні Радзімы.

Адшумела чырванню сцягоў, светлай радасцю святочная пара, але той настрой, які выклікан юбілеем, застаўся і дапамагае працаваць і вучыцца яшчэ з большым натхненнем, з большымі вынікамі.



*Колона універсітэта ўваходзіць на Цэнтральную плошчу Мінска 7 лістапада. Фота Г. САЖНЕВА.*

## ВІНШУЕМ!

У азнаменаванне 50-годдзя Савецкай улады за поспехі ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных кадраў, выкананні сацыялістычных абавязацельстваў рэктарат, партыйны камітэт і мясцком узнагародзілі вялікую групу выкладчыкаў і супрацоўнікаў. У Кнігу Гонару занесены імёны старэйшых і вядомых вучоных І. С. Лупіновіча, Р. Л. Старобінца, М. Ф. Ярмоленкі, М. М. Паўлючэнкі, І. Р. Цішчанкі, П. З. Савачкіна, Ф. Д. Гахава, М. П. Яругіна, М. І. Лушчыцкага, У. І. Крылова, Ц. М. Годнева, М. Р. Ларчанкі, У. Г. Вафіядзі, М. А. Ельяшэвіча, А. Н. Сеўчэнкі. А. Х. Турэцкага, Ф. І. Фёдарава, У. М. Сікорскага, Д. П. Жмуроўскага, А. А. Філімонава, А. Я. Малышава, А. В. Кірсанава.

Ганаровымі граматамі ўзнагароджана 249 чалавек, граматамі — 187, грашовымі прэміямі і падзякамі адзначана 560 чалавек.

* * *

Напярэдадні свята Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР узнагародзіў вялікую групу дзеячоў літаратуры і мастацтва рэспублікі. Ганаровых грамат удастоены выкладчыкі універсітэта — крытык І. Д. Казека, пісьменнікі І. Я. Навуменка, Н. С. Гілевіч, І. І. Семяжонаў.

## ТЭАРЭТЫЧНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

*На падрыхтоўчым факультэце універсітэта праведзена тэарэтычная канферэнцыя выкладчыкаў і супрацоўнікаў на тэму «Вялікі Кастрычнік і нацыянальна-вызваленчы рух». Канферэнцыю адкрыў дэкан факультэта кандыдат эканамічных навук Міхаіл Кірылавіч Гарбачоў.*

*З дакладам «Уплыў Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі на развіццё нацыянальна-вызваленчай барацьбы народаў Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі» выступіў намеснік сакратара партарганізацыі факультэта выкладчык курса «Савецкі Саюз» Д. С. Капітан.*

*Затым старшы выкладчык кафедры рускай мовы Л. А. Міцкевіч у сваім выступленні раскрыла сутнасць нацыянальна - вызваленчага руху на сучасным этапе.*

*На асаблівасці развіцця вызваленых краін звярнула ўвагу ўдзельнікаў тэарэтычнай канферэнцыі выкладчык кафедры прыродазнаўчых дысцыплін А. І. Савон.*

*Аб тым, якую падтрымку і практычную дапамогу маладым самастойным краінам аказваюць Савецкі Саюз і іншыя краіны сацыялістычнай сістэмы, расказала прысутным старшы выкладчык кафедры рускай мовы З. Л. Коласава. А сакратар камсамольскай арганізацыі факультэта выкладчык кафедры прыродазнаўчых дысцыплін Г. П. Афанасьеў у спыніўся на крытыцы пагляду кіраўніцтва Камуністычнай партыі Кітая па пытаннях нацыянальна-вызваленчага руху.*

*У рабоце канферэнцыі, прысвечанай 50-годдзю Савецкай улады, прымаў удзел старшы інспектар Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР Г. І. Гракаў.*

*УЛ. ГАЛАЙША.*

## Не згаснуць подзвігі бацькоў



Выхаванне моладзі на традыцыях рэвалюцыйна-баявой і працоўнай славы стала неад'емнай часткай усёй палітыка-выхаваўчай работы нашых універсітэцкіх калектываў і грамадскіх арганізацый. У юбілейным годзе, яшчэ задоўга да Кастрычніцкіх свят, сталі паўсядзённымі гутаркі, сустрэчы, лекцыі, дыспуты, канферэнцыі. Усе яны былі накіраваны на тое, каб лепш данесці і паказаць неўміручую славу подзвігаў бацькоў, якая з кожным годам памнажаецца і квітнее разам са славай працоўных подзвігаў маладшага пакалення.

Нельга не адзначыць цёплым словам працавіты калектыў нашай універсітэцкай бібліятэкі, які разам з камсамольскай і іншымі арганізацыямі вядзе плённую работу сярод моладзі.

Напярэдадні свята, 27 кастрычніка, у чытальнай зале праходзіла цікавая канферэнцыя чытачоў — «Рэвалюцыйная героіка ў літаратуры і мастацтве». Кіравалі ходам канферэнцыі дацэнт кафедры рускай літаратуры У. С. Карабан і супрацоўнік бібліятэкі А. М. Рукшын. Характэрным з'яўляецца тое, што на гэтай канферэнцыі было многа жадаючых выступіць, падзяліцца сваімі ўражаннямі па тым ці іншым мастацкім творы. А творы абмяркоўваліся самыя розныя, як савецкіх, так і замежных аўтараў: К. Сіманава, С. Ясеніна, М. Святлова, А. Твардоўскага, Дж. Рыда.

Не менш цікавым быў і дыспут па кнізе І. Д. Ветрава «Браты па зброі», які таксама арганізавалі супрацоўнікі бібліятэкі разам з актывам III курса гістарычнага факультэта. На гэтым дыспуце прысутнічаў сам аўтар кнігі І. Д. Ветраў — сакратар Палескага абкома партыі, камандзір партызанскага злучэння ў гады Вялікай Айчыннай вайны, на грудзях якога ззяе 25 урадавых узнагарод Савецкага Саюза, Польшчы, Чэхаславакіі. І. Д. Ветраў расказаў студэнтам аб сваім баявым шляху і шляху «братоў па зброі».

Гасцямі моладзі былі і Герой Савецкага Саюза Р. А. Такуеў — камандзір камсамольска-маладзёжнага дыверсійнага атрада, і К. М. Марозаў — камандзір Другой Калінкавіцкай партызанскай брыгады імя Фрунзе, цікавай і шчырай.

У канцы гэтай незабыўнай сустрэчы ветэранам былі ўручаны букеты жывых кветак.

С. АЛЯКСАНДРАЎ.

На здымку: І. Д. Ветраў у час гутаркі са студэнтамі.

Фота І. Аскіркі.

## НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

# ЗАЎЖДЫ Ў СТРАІ



Кожнае імгненне жыцця Андрэя Рыгоравіча Мядзведзева, прафесара кафедры глебазнаўства, доктара сельскагаспадарчых навук, члена-карэспандэнта АН БССР, насычана плённай дзейнасцю. Мабыць гэта таму, што пачатак яго працоўнага шляху прыйшоўся на першыя гады існавання Савецкай улады, і рытм таго часу наклаў адбітак на характар будучага вучонага. Ён і цяпер, адзначыўшы 70-годдзе з дня нараджэння і 46-годдзе навуковай, педагагічнай і грамадскай дзейнасці, да драбніц унікае ў сутнасць кожнага пытання, ці працуе ён самастойна, ці кансультуе аспірантаў і студэнтаў. Ён увесь адданы сваёй любімай справе і гэтым прыцягвае да сябе шматлікіх вучняў.

Навуковая дзейнасць Андрэя Рыгоравіча заўсёды цесна звязана з практыкай сельскай гаспадаркі. Ён адзін з заснавальнікаў аграглебавых даследаванняў на тэрыторыі Беларусі, аўтар звыш 80 навуковых прац і каля 740 глебавых карт.

За плённую педагагічную і навукова-даследчую работу Андрэй Рыгоравіч быў удастоен права ўдзельнічаць ва Усесаюзнай выстаўцы ў 1941 годзе. Багаты вопыт у галіне навукі і практыкі сельскай гаспадаркі ён перадае студэнтам. Лекцыі старэйшага выкладчыка выклікаюць вялікую цікавасць і прыводзяць энтузіастаў глебазнаўства ў яго навукова-даследчы гурток.

Заслугі Андрэя Рыгоравіча ў развіцці сельскай гаспадаркі Беларусі адзначаны высокімі ўрадавымі ўзнагародамі — ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам «Знак Пашаны», медалямі і Ганаровымі граматамі.

Хочацца пажадаць нашаму юбіляру моцнага здароўя і далейшай плённай навуковай, педагагічнай і грамадскай дзейнасці.

**М. ЧАРТКО.**

## ПЕРАМОЖЦА КОНКУРСУ

Бюро ЦК ЛКСМБ падвяло вынікі рэспубліканскага конкурсу на лепшы твор літаратуры і мастацтва аб моладзі, камсамоле Беларусі, прысвечанага 50-годдзю Савецкай улады. На конкурс было прадстаўлена шмат розных па жанру і зместу твораў, якія найбольш глыбока раскрываюць духоўны свет нашага маладога сучасніка. Сярод лаўрэатаў — дацэнт нашага універсітэта пісьменнік Іван Якаўлевіч Навуменка. Гэтае ганаровае званне прысвоена яму за зборнік апавяданняў «Таполі юнацтва».

**І. ДУБОЎСКІ.**

# ЭЛІКСІР МАЛАДОСЦІ

**Калісьці, яшчэ ў юнацтве, у адной з першых паэтычных спроб школьнік Міхась Ларчанка пісаў пра сваё жаданне знайсці эліксір «вечнай маладосці». Мара юнака здзейснілася: сёння проста цяжка паверыць, што 14 лістапада Міхасю Рыгоравічу споўнілася шэсцьдзесят год — ні знешні выгляд, ні тэмперамент не паказваюць на гэта. Тым больш цяжка даць веры, што гэты няўрымслівы ў працы, з цвёрдым юнацкім крокам і, я сказаў бы, камсамольскім агеньчыкам у вачах чалавек пражыў зусім нялёгкае, складанае жыццё. Яго працоўнае басаногае маленства прайшло ў вёсцы Хварасцяны Магілёўскай вобласці на беразе невялічкай рачулкі з лагоднай назваю Субота. Умовы склаліся так, што пасля пачатковай школы трэба было застацца дома на гаспадарцы: у сваёй вёсцы сямігодкі не было, а наняць для сына кватэру ў мнагадзетных бацькоў не было за што. І толькі ў 17 гадоў цікаўны і здольны юнак змог працягваць далей перапыненую вучобу.**

**Школа сялянскай моладзі, камсамольскае юнацтва пакінулі незабыўны след у сэрцы Міхася Ларчанкі. Менавіта тады, менавіта тут знайшоў ён запаветны эліксір маладосці — у любві да людзей, да Бацькаўшчыны, у чалавечай дабраце і незвычайнай душэўнай шчодрасці. Пазней — і ў Магілёўскім педтэхнікуме, і ў нашым універсітэце — і амаль усіх будзе ўражваць высокая чалавечнасць яго, гуманізм самай высокай пробы.**

**Настойлівая праца над кнігай, роздум над жыццём прадвызначылі далейшы шлях юнака — вучобу ў аспірантуры АН БССР, абарону ў 1936 годзе кандыдацкай дысертацыі, літаратуразнаўча-крытычную працу. Затым вайна. Фронт. Цяжкае раненне. Адразу пасля вайны — педагагічная праца ў Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна, у якім да сённяшняга дня Міхась Рыгоравіч выкладае беларускую літаратуру. Прафесара, доктара філалагічных навук, загадчыка кафедры, яго ў нашым універсітэце ведаюць многія. У навуковым свеце знаюць яго шматлікія працы пра**



**станаўленне рэалізму ў беларускай літаратуры, даследаванні пра беларуска-славянскія літаратурныя ўзаемасувязі.**

**З кожным годам пашыраецца кагорта вучняў прафесара Ларчанкі. Сёлета абараніў дысертацыю яго трыццаць першы аспірант.**

**У сваёй аўтабіяграфіі Міхась Рыгоравіч Ларчанка нядаўна пісаў: «Мара аб вечнай маладосці не пакідае мяне і цяпер». Няхай жа, дарагі наш юбіляр, яна ніколі не пакідае Вас!**

**В. РАГОЙША.**

# НАША, УНІВЕРСІТЭЦКАЯ

У сховішчах універсітэцкай бібліятэкі цяпер налічваецца звыш 850 тысяч тамоў. Тут кнігі, толькі што паступіўшыя з друкарняў, і кнігі, якія дайшлі да нас праз стагоддзі. Але які б год выдання ні стаяў на іх вокладках, мы па праву звязваем нараджэнне гэтага вялізнага кніжнага багацця з Кастрычнікам. І не толькі таму, што рэвалюцыя упершыню адкрыла доступ да кнігі мільёнам працоўных. Яна і захавала для народа найбольш унікальныя выданні.

У гістарычных архівах маецца цікавы дакумент — загад галоўнакамандуючага арміі Заходняга і Паўднёва-Заходняга фронту А. Мяснікова. Ён адзначан датай 28 снежня 1917 года. На беларускай зямлі ў тыя дні яшчэ не было патушана полымя вайны. Уся яна прадстаўляла фронт ці прыфрантавую паласу. У гарадах і сёлах гаспадарыла разруха. Для маладой Савецкай рэспублікі набліжалася пара новых выпрабаванняў. Але ў гэтым загадзе гаварылася не аб ваенных аперацыях. Галоўнакамандуючы звяртаў увагу вайсковых камітэтаў на кнігі і культурныя каштоўнасці.

«...Асаблівыя клопаты з боку камітэтаў,—пісаў А. Мяснікоў,—павінны выклікаць бібліятэкі, усемагчымыя навуковыя дапаможнікі і іншае, што належыць як вайсковым часцям, так і школам ці ўласным асобам у прыфрантавой паласе. Ні адна кніга не павінна загінуць, не павінна быць бяздумна знішчана.

У кнігах цяпер адчуваецца вялікая патрэба як у горадзе, так і ў вёсцы.

Вялікая адказнасць ускладаецца самім жыццём на вайсковыя камітэты: зберагчы ў цэлым і перадаць для патрэб працоўнага народа... культурныя каштоўнасці...»

Салдаты рэвалюцыі зберaглі кнігі, якія склалі аснову кніжнага фонда многіх бібліятэк рэспублікі, у тым ліку і універсітэцкай. Народны камісарыят асветы БССР перадаў ёй у 1921—1922 гадах звыш 40 тысяч тамоў.

Кастрычнік па-новаму паставіў бібліятэчныя сувязі, ператварыў кнігу ў сапраўднага праваднікa дружбы народаў. З самага пачатку свайго ўзнікнення універсітэцкая бібліятэка атрымлівала дапамогу ў камплектаванні сваіх фондаў з розных куткоў краіны. Расійская кніжная палата дала ёй магчымасць атрымліваць бясплатны экземпляр усіх выходзіўшых выданняў. Такое ж права дала Украіна. Поўны камплект—2800 тамоў—выданняў Археаграфічнай камісіі і ўрадавых архіваў падарыла Расійская Акадэмія навук.

Бібліятэка не толькі расла сама, але і давала пуцёўку ў жыццё іншым бібліятэкам рэспублікі. На яе базе 14 мая 1926 года створана Беларуская дзяржаўная бібліятэка імя У. І. Леніна, некалькі пазней — бібліятэкі медыцынскага, палітэхнічнага, педагагічнага інстытутаў і інстытута народнай гаспадаркі.

На многіх кнігах побач з нашымі стаяць штампы бібліятэк МДУ, ЛДУ, Маскоўскага гарадскога педінстытута і іншых вышэйшых навучальных устаноў краіны. Гэта асабліва дарагія кнігі. Яны напамінаюць аб падмаскоўнай станцыі Сходня, дзе ў канцы вайны ўзнавіў работу універсітэт і пачалося адраджэнне яго бібліятэкі. Каля 20 тысяч кніг падарылі тады нам маскоўскія, ленінградскія і іншыя вышэйшыя навучальныя ўстановы.

Бібліятэка пачынала пасля звароту ў Мінск з малога. Дзякуючы шырокім сувязям, кніжны фонд яе павялічыўся за пасляваенныя гады ў 42 разы. Цяпер штогод паступае ў бібліятэку 45—50 тысяч кніг, часопісаў і іншых выданняў. Яна вядзе кнігаабмен са 120 блізкімі па роду бібліятэкамі вучэбных і навуковых устаноў СССР і краін народнай дэмакратыі...

Нядаўна ў вестыбюлі універсітэта студэнты назіралі, як малады асістэнт дарыў аўтарэферат кандыдацкай дысертацыі вядомаму вучонаму.

— Гэта вельмі дарагі падарунак, — гаварыў вучоны,—таму што гэта часцінка чалавечага сэрца.

Так можна сказаць і аб кнізе. Ёсць розныя кнігі па значнасці, па вышыні свайго нялёгкага подзвігу. Ёсць кнігі сусветнавядомыя, ёсць і такія, якія закранаюць вузкую сферу быцця, і межы іх папулярнасці больш скромныя. Але якімі б маштабамі не вымяралася іх належнасць, яны ўвасабляюць часцінку сэрца аўтара. І ўсе яны ў пэўным выніку служаць адной карыснай мэце — дапамагчы чалавеку глыбей пранікнуць у таямніцы прыроды.

Сярод многіх тысяч кніг, якія маюцца сёння ў бібліятэцы, вялікае месца займаюць і працы вучоных універсітэта. Каля дзесяці тысяч кніг, артыкулаў, брашур, даследаванняў маецца толькі на ўліку яе каталогаў. Гэта вельмі знамянальная з'ява. Яна яшчэ раз сведчыць аб тым, якія магутныя крылы выраслі ў навуковай думцы рэспублікі пасля Кастрычніка.

На выстаўцы, прысвечанай паўвекавому юбілею Савецкай улады, прадстаўлена каля шасцісот прац вучоных старэйшых пакаленняў. Сярод іх — працы буйнейшага гісторыка-славіста, першага рэктара універсітэта В. І. Пічэты, прафесараў А. Н. Сеўчанкі, В. І. Сцяпанава, Д. А. Супруненкі, Н. Ф. Ярмоленкі, М. А. Ельяшэвіча, Б. В. Ерафеева, Т. Н. Годнева і іншых, якія атрымалі вядомасць не толькі ў СССР, але і за межамі краіны. Тут і арыгінальныя працы прафесара І. М. Лушчыцкага і яго вучняў па гісторыі грамадска-палітычнай і філасофскай думкі ў Беларусі, кнігі прафесара У. М. Сікорскага, дацэнтаў М. Р. Круцько, П. П. Сіліванчыка.

У нашых кніг удзячная, дапытлівая аўдыторыя. Бібліятэка штодзённа выдае тысячы экземпляраў розных выданняў. Яе чытальныя залы кожны дзень наведвае каля 2500 чалавек.



ГЭТА ПРАЦЫ НАШЫХ ВУЧОНЫХ

Фота Д. ПРЭСА.

# ШАШКІ

# ВЯЛІКІ ПОСПЕХ

**У чэмпіянаце рэспублікі па міжнародных шашках вялікі поспех выпаў на долю студэнта матэматычнага факультэта нашага універсітэта Анатоля Гантварга. Стаўшы пераможцам у сямі партыях і закончыўшы унічыю шэсць, ён набраў 10 ачкоў і ўпершыню заваяваў залаты медаль чэмпіёна рэспублікі.**

**Больш сціплы поспех нашых шашыстак у фінале XII чэмпіяната СССР па рускіх шашках. Няўдача ў першым туры не дала магчымасці Лене Соркінай стаць прызёрам. Аднак, набраўшы 8 ачкоў, яна заняла ганаровае чацвёртае месца ў чэмпіянаце СССР. Аня Хапалюк і яшчэ дзве ўдзельніцы чэмпіяната— Іраіда Спаская і Люся Бендэрская — набралі па 7 ачкоў. Па табліцы каэфіцыентаў шостае месца присуджана А. Хапалюк.**

**М. КУЗНЯЦОЎ.**





**На здымках: Лена Соркіна (злева) і Анатоль Гантварг у час паядынкаў.**

# Перамагла... прыгажосць

Не так даўно нашы дзяўчаты пабывалі ў Балгарыі. А напярэдадні свята з адказным візітам прыехалі да нас сем прыгожых сімпатычных балгарскіх гімнастак. Так завязалася сяброўства паміж студэнткамі, якое будзе расці і мацнець.

Крыху аб камандзе гасцей. Усе яны — студэнткі, будучыя фізікі, хімікі, матэматыкі, філолагі. Трэніруюцца ў спартыўным студэнцкім аб'яднанні «Акадэмік». Усе майстры спорту. Прызёры рэспублікі. Самая малодшая ў камандзе— Марыя Міхайлава, ёй 19 год, а ветэрану, Стэфцы Нікалавай, 24 гады. Іскра Цанкава і Румяна Петкава прышлі ў гімнастыку праз балет, а астатнія дзяўчаты займаюцца мастацкай гімнастыкай ужо некалькі год.

Але вернемся ў спартыўную залу. Сёння тут вельмі шмат гледачоў..

Парад удзельніц, абмен вымпеламі і — спаборніцтвы пачаліся. Першай выходзіць наша спартсменка майстар спорту Марыя Давыдава. Яна выконвае практыкаванні з вымпеламі. За ёй — балгарка Нікалава. Удзельніцы вельмі хвалююцца.

Выступленні ідуць па трох адвольных праграмах, дзве з якіх з прадметам: са скакалкай, мячом, стужкамі... І музыка лунае то павольная і меладычная, то хуткая і імклівая.

Пасля першага віду адвольнай праграмы нашы дзяўчаты праігрывалі каля 0,4 бала. Аднак заключнае выступленне студэнткі чацвёртага курса хімфака Таццяны Філонавай. якая заслужана атрымала высокую ацэнку (9,6 бала), выводзіць нашу каманду наперад. Т. Філонава заняла першае месца. Другой была таксама наша гімнастка майстар спорту Ліда Гуменюк. Трэцяе месца дасталася балгарцы Румяне Петкавай.

Спаборніцтвы закончыліся, але балгарскія дзяўчаты не сумуюць. Усе адразу перамагчы не могуць. Будуць яшчэ сустрэчы, будуць і перамогі. Галоўнае ў тым, што яны знайшлі сабе новых сяброў.

Т. ЯКАЎЛЕВА.

## *Студэнцкае жыццё за рубяжом*

# СУСТРЭЧЫ Ў ШВЕЦЫІ

З 26 верасня па 6 кастрычніка гэтага года я знаходзіўся ў складзе спецыялізаванай турысцкай групы Усесаюзнага Таварыства «Веды» ў Швецыі. Нас было 23 чалавекі: па аднаму прадстаўніку ад кожнай рэспублікі, астатнія— з РСФСР. Мэта паездкі — далейшае ўмацаванне культурных сувязей і дружбы з суседнімі краінамі, праўдзівая інфармацыя аб СССР, вывучэнне Швецыі. Каб лепш справіцца з гэтай задачай, у групу былі ўключаны вучоныя розных галін ведаў: гісторыкі, філосафы, юрысты, філолагі, фізікі, біёлагі, педагогі і г. д. Трэба сказаць прама, што калектыў нашай групы быў падабраны ўдачна: нам самім цікава было слухаць адзін аднаго, а шведам — тым больш. Шведы — людзі стрыманыя, знешне спакойныя, але амаль кожны раз пасля таго, як нас прадстаўлялі, ускліквалі: «О! Як цікава нам убачыць прадстаўнікоў розных нацый у адной дэлегацыі!... Так, нам радасна, што можам гаварыць па розных пытаннях...»

Шведы не любяць дакладаў і доўгіх прамоў. Мы гэта ўлічылі. І ўсе сустрэчы з прадстаўнікамі розных слаёў насельніцтва ва ўсіх васьмі гарадах, якія мы наведалі, праходзілі ў выглядзе прэс-канферэнцый, гутарак за круглым сталом, вечароў пытанняў і адказаў і г. д. Кожны дзень мы стваралі невялікія групы па спецыяльнасцях і адпраўляліся на сустрэчы. Аб іх расказана было ў 23 шведскіх газетах. Прычынай такой зацікаўленасці быў і інтэрнацыянальны склад нашай дэлегацыі, яе шырокае прадстаўніцтва і тыя абставіны, што шведы, з якімі мы сустракаліся, вельмі цанілі ў нас тую якасць, якая аб'яднала, на погляд шведскіх журналістаў, савецкіх вучоных — «імкненне бескарысна несці свае веды народу». У гэтым немалая заслуга і шведскай прафсаюзнай асветніцкай арганізацыі — АБФ, якая запрашала нас у сваю краіну.Але самае галоўнае — гэта прыкметны рост зацікаўленасці шведскай грамадскасці да савецкай краіны, да жыцця нашага народа, які ступіў за такі кароткі гістарычны час да вяршынь сацыяльнага і тэхнічнага прагрэсу. Падвёўшы вынікі ўражанняў аб паездцы, мы — савецкія турысты — сышліся на тым, што лёд шведскай абыякавасці да сацыялістычных краін, прыкрываемай палітыкай нейтралітэту, крануўся, растаў. І гэта адчуваецца усюды.

Асабліва адчулі мы гэта ў час сустрэчы са студэнтамі універсітэтаў у Гётэборгу і ў Упсала. У Гётэборгскім універсітэце мерапрыемствы былі незапланаванымі. Дарэчы, здолеўшы выклікаць да сябе сімпатыі і павагу шведаў, група мела многа іншых сустрэч, непрадугледжаных планам. Да студэнтаў мы ішлі ўсёй групай. Сустрэчы з імі былі самымі цёплымі, відаць, найбольш цікавымі і задушэўнымі.

Вечарам 28 верасня кіраўнік нашай групы П. В. Смірноў пазнаёміў мяне з выпускніцай гуманітарнага факультэта Гётэборгскага універсітэта Брыт-Мары Закрыпсоп, якая вывучала рускую мову. Мары зацікаўлена савецкай мастацкай літаратурай, мастацтвам, праблемамі моладзі. Яна згадзілася паказаць нам вячэрні горад. Блукаючы па вуліцах Гётэборга, мы дамовіліся наведаць студэнцкі інтэрнат і лінгвістычнае аддзяленне універсітэта. Раніцой Мары паведаміла, што студэнты і выкладчыкі рады нас бачыць.

І вось мы ў інтэрнаце. Гэта даволі ўтульны шматпавярховы будынак, разлічаны на 300 месц, пабудаваны ў 1950 годзе. У горадзе сем такіх дамоў. Да іх прымыкаюць домікі крыху меншыя, у якіх таксама жывуць студэнты. У інтэрнатах — студэнты розных вну: універсітэта, камерчаскага і тэхналагічнага інстытутаў. Пакоі разлічаны на аднаго і двух чалавек; тэлефоны, кухня і санпункт — блочныя. У інтэрнаце ёсць кіёскі, зала для тэлебачання, спортзал, пакой хоббі, душ. Студэнты адчуваюць сябе поўнымі гаспадарамі. Аб усім гэтым расказала нам і паказала член студсавета Інгрыд Салін. Ад яе мы даведаліся, што кожны студэнт плаціць за месца 198 крон у месяц, не лічачы платы за тэлефон. Гэта — высокая плата. На кватэры такі пакой каштуе 140 крон у месяц. Але, паколькі ў інтэрнаце цікавей, маладыя людзі імкнуцца трапіць у яго. Праўда, здзейсніць гэта з-за чаргі не так проста: як правіла, інтэрнат атрымліваюць у канцы другога, пачатку трэцяга года навучання ў вну.

Вечарам нас сустракалі студэнты і выкладчыкі ў навучальным корпусе гуманітарнага факультэта. На гэты раз мы былі ў гасцях у студэнтаў, якія вывучаюць рускую мову. Іх было каля 50 чалавек. Студэнты кожнай краіны — народ асаблівы. Скінуўшыся па 6 крон, шведы падрыхтавалі для нас пачастунак: сухое віно, піва, вінаград, сыр, піражнае. Усё гэта было прыгожа растаўлена на сталах літарай «П», на якіх гарэлі свечкі. Абставіны натхнялі на асабістыя размовы ,і мне прышлося засунуць тэзісы свайго выступлення ў кішэню. Замест гэтага трэба было ў кароткім тосце выказаць асноўныя думкі. Пасля кароткага ўступнага слова шведскага выкладчыка прапанавалі выступіць мне, як самаму маладому члену дэлегацыі, які да гэтага ж спецыялізуецца па маладзёжнай тэматыцы. Адзначыўшы, што студэнтаў усіх краін аб'ядноўвае аптымізм, дапытлівасць і імкненне да салідарнасці, назваўшы цыфру навучэнцаў у вну, тэхнікумах і школах СССР, я заўважыў, што шведскім студэнтам ёсць з кім сябраваць у савецкай студэнцкай краіне, аб'явіў тост у гонар дружбы савецкіх і шведскіх студэнтаў. Жарты, прымаўкі шведам прышліся па душы. Неўзабаве на розных мовах — рускай, шведскай, нямецкай, англійскай, іспанскай —загаварылі і гаспадары і госці. Але тосты і песні гучалі толькі на рускай мове, танцавалі пад савецкую музыку. Расходзіліся а 12 гадзіне ночы, поўныя самых незвычайных уражанняў. Гаспадарам мы дарылі кнігі, значкі, сувеніры, альбомы аб жыцці савецкіх гарадоў і рэспублік.

Аб усім немагчыма расказаць у адной карэспандэнцыі. Адзначу толькі наступнае: інфармацыя аб нашай краіне ў Швецыі недастатковая, а часамі —і няправільная; студэнты шкадуюць, што мала ведаюць пра СССР; маладыя людзі толькі гавораць, што яны «не цікавяцца палітыкай», а на самай справе задумваюцца над сацыяльнымі праблемамі.

Аднак, перш чым рабіць абагульненні, раскажу яшчэ аб наведванні двух навучальных устаноў.

5-га кастрычніка мы наведалі Упсальскі універсітэт і прафсаюзную школу. Горад Упсала — сапраўды маладзёжны. Ён нечым нагадвае Тарту. Працэнтаў сорак яго жыхароў — студэнты.

Універсітэт у Упсала пабудаваны ў 1477 годзе па ўзору універсітэта ў Балоні. Спачатку ў ім мелі перавагу тэалагічныя навукі, але з пачатку XVIII стагоддзя —прыродазнаўчыя. У цяперашні час універсітэт мае чатыры факультэты: медыцынскі, тэалагічны, юрыдычны і філасофскі. Апошні складаецца з гуманітарнага, матэматыка-прыродазнаўчага і грамадскага аддзяленняў. Усяго ў вну 20 тысяч студэнтаў, 5 тысяч выкладчыкаў. Тэрмін навучання да сямі гадоў (медыцынскі факультэт), на некаторых — да 5 гадоў. Мы наведалі галоўны корпус універсітэтаў, нагадваючы па наяўнасці экспанатаў музей. Спадабалася актавая зала, разлічаная на 2 тысячы месц. У ёй выступалі Валеры Быкоўскі і Валянціна Церашкова. Каля яго ўвахода напісана: «Думаць свабодна —вялікая справа, але думаць правільна — значна лепш».

Пабывалі мы ў гістарычным і славянскім інстытутах, якія працуюць пры гэтым універсітэце, з цікавасцю правялі час у выставачнай зале Акадэмічнай (універсітэцкай) бібліятэкі «Караліна», дзе захоўваюцца найбольш рэдкія дакументы: «Сярэбраная біблія», кніга Рыгора Паташыхіна, напісаная на старажытнарускай мове, пісьмы Франкліна, Эдзісона, Мендэля, Гётэ, М. Твена і іншых вялікіх людзей.

Некалькі слоў аб славянскім інстытуце. Ён існуе каля 40 год і ў цяперашні час налічвае 300 студэнтаў. Каля дзесяці гадзін у тыдзень адведзена на вывучэнне рускай мовы, апошні час — на геаграфію, грамадзянскае права і палітэканомію славянскіх народаў. У бібліятэцы інстытута літаратура для даведак — на рускай мове.

Цікавая сістэма навучання ў вну Швецыі. Пасля заканчэння гімназіі па тэарэтычнаму курсу паступаючы падае заяву ва універсітэт. За час навучання ў вну, яму неабходна набраць мінімум шэсць балаў для таго, каб мець права выкладаць у гімназіі. Калі ён пойдзе ў навуку, дык набірае за гады вучобы восем ці дзесяць балаў. Прадметы камбінуе студэнт на свой погляд, зыходзячы з таго, што яму найбольш спатрэбіцца ў будучым. Скажам, ён можа выбраць гісторыю, астраномію і мову — гэта справа студэнта. Большасць выбірае прыродазнаўчыя і прававыя навукі. Але абавязковай умовай для тых, хто хоча мець стыпендыю, з'яўляецца атрыманне аднаго бала ў семестры, г. зн. здаць за паўгода прадмет. Гэты бал ён можа атрымаць адразу, здаўшы поўнасцю курс, а можа і па частках.

Характэрна, што ўсе студэнты знаюць французскую ці англійскую мову, таму што выкладанне іх вядзецца з чацвёртага класа адзінай дзесяцігадовай школы, і вывучэнне з'яўляецца абавязковым.

Навучанне ў вну бясплатнае, студэнты, якія адчуваюць патрэбу, атрымліваюць стыпендыю— каля 8000 крон у год. Аднак пасля заканчэння вну студэнт вяртае на працягу трох ці больш гадоў па 6300 крон дзяржаве ў год, 1700 крон дзяржава дае беззваротна. Медыцынскае абслугоўванне ў студэнцкіх клініках — бясплатнае, аднак у гарадской за наведванне трэба плаціць пяць крон. Падручнікі выдаюцца студэнтам бясплатна, у вельмі абмежаванай колькасці. Студэнт за пяць год навучання павінен траціць на кнігі да 4 тысяч крон, таму што кнігі ў Швецыі вельмі дарагія (адна кніга можа быць роўнай па цане адной пары выхадных туфляў). На харчаванне ў месяц ідзе як мінімум 500 крон, калі ж студэнткі гатуюць самі — 350 крон. Гэта таксама дарага. Такім чынам, студэнтам прыходзіцца не так ужо і лёгка. Большасць з іх вымушаны працаваць, каб мець магчымасць схадзіць у кіно, тэатр, купіць падручнікі. Вядома, калі бацькі жывуць у поўным дастатку, то студэнт гэтыя балы можа набіраць многа гадоў: яму ж не патрэбны дзяржаўны заём на навучанне.

Цікавай была сустрэча ў прафсаюзнай школе, мэта якой рыхтаваць кадры для муніцыпальных арганізацый і устаноў. Такіх школ у Швецыі дзве. Сацыял-дэмакратычная партыя прыдае ім вялікае значэнне. Пасля таго, як мы агледзелі бібліятэку і карпусы школы, дырэктар запрасіў нас на размову да слухачоў. Гэта былі юнакі і дзяўчаты ад 20 да 30 гадоў, чалавек сто... Трымаліся яны свабодна, курылі, гучна абмяркоўвалі паміж сабой нашы адказы, пакуль перакладчык пераказваў нам іх пытанні. А абмяркоўваць было што. Нас пыталі: «Калі савецкі чалавек не з'яўляецца членам прафсаюза, ці гарантавана яму работа?»; «Ці ёсць у вас адзінокія маці і якія правы іх дзяцей?»; «Ці вядзецца ў вас статыстыка шлюбаў і іх скасаванняў і як яна выглядае?»; «Якія льготы мае савецкі студэнт?»... Пыталі аб становішчы ў В'етнаме, на Блізкім Усходзе, аб адносінах паміж СССР і ЗША. Дарэмна нас запэўнівалі, што шведскую моладзь не цікавяць палітычныя пытанні! Есць, вядома, у Швецыі частка юнакоў і дзяўчат, якія вядуць бестурботнае жыццё, займаюцца п'янствам, наркацізмам і распуснасцю, але гэта ў меншай меры датычыцца студэнцтва.

Студэнты — народ працавіты і дапытлівы. Яны рады кожнаму праўдзіваму слову аб нашай сацыялістычнай краіне. Ад імя студэнцкай і рабочай моладзі Швецыі яны перадавалі савецкім юнакам і дзяўчатам самыя цёплыя пажаданні і прывітанні. І я выконваю гэта з вялікай ахвотаю!

С. ЛАПЦЁНАК,
в. а. дацэнта кафедры гісторыі філасофіі і логікі,
кандыдат філасофскіх навук.

**Рэктарат, партком і мясцком выказваюць глыбокае спачуванне дацэнту кафедры гісторыі філасофіі і логікі Крукоўскаму Мікалаю Ігнатавічу з выпадку напаткаўшага яго гора — смерці маці.**

**Калектыў кафедры гісторыі філасофіі і логікі выказвае глыбокае спачуванне М. І. Крукоўскаму з выпадку смерці маці.**

*Згублены студэнцкі білет № 630282 на імя Сіроткіна Анатоля Пятровіча, студэнта V курса фізічнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна, лічыць несапраўдным.*

Рэдактар М. Іоська.

Зак. 1729. АТ 17656. Наш адрас: Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. № 106. Тэлефон Б-2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда».